НОВЫЯ ВЫДАННІ

# Святлінкі душы

**Вельмі прыемна і нават знакава, што ў Год малой радзімы, напярэдадні святкавання 1000-годдзя Брэста, пабачыў свет першы нумар літаратурнага перыядычнага выдання «Берасцейская скарбніца». Калектыўныя зборнікі заўсёды прыцягвалі ўвагу шматлікіх чытачоў магчымасцю пазнаёміцца з рознымі творчымі накірункамі, паэтычнымі стылямі, светапоглядамі паэтаў і празаікаў, іх светаадчуваннем і светаўспрыманнем.**

Рэдактарам-укладальнікам альманаха з'яўляецца сябра Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік-фантаст, гісторык па адукацыі, лаўрэат шматлікіх літаратурных конкурсаў Сяргей Белаяр.

Літаратурнае выданне складаецца з сямі раздзелаў. У першым – «Жамчужныя россыпы» – прадстаўлены вершы васямнаццаці паэтаў. Расчыняе дзверы ў прыгожы свет паэзіі сваім лірычным роздумам Вера Вакула. Паэтычныя творы Васіля Баннава, Лідзіі Касачук, Віктара Рэчыца здзіўляць чытача вострым успрыняццем абставін жыцця. У паэзіі Таццяны Шульгі і Ліліі Высоцкай вяршэнствуюць жаночыя пачуцці – імклівыя і пяшчотныя. Іван Дацкевіч і Віктар Хмарук паэтычным словам малююць свае сусветы, вырываючы з памяці дзівосныя шчымлівыя моманты. Вершы Ірыны Морых, прысвечаныя цыклам прыроды і музыцы, сатканы з незвычайных незабыўных эпітэтаў і метафар. Светламіра Васілюк шчыра прызнаецца ў любові роднаму Брэсту. Як матуліна калыханка – ласкава і цёпла гучаць радкі Галіны Бабарыкі, Зінаіды Навасад, Валянціны Кульбеды-Бакун, Валянціны Пігас, у якіх славяцца родныя краявіды, любыя сэрцу беларускія мястэчкі. Сярод паэтычнай падборкі Надзеі Парчук прыцягваюць увагу ўрачыстасцю прысвячэнні знакавым фігурам беларускай культуры – Яўгеніі Янішчыц і Алесю Бачыла. Баранавіцкі паэт Юрый Мацюшка запрашае ў вандроўку па жыцці – няпростую, камяністую, і ў сваіх адчайных пошуках шчасця ён вядзе нас да агню мудрасці. Вершы маладой паэткі з Камянца Настассі Нарэйкі – дыханне жыцця і мяцежная прыгажосць. Паэтычныя вобразы выразныя, арыгінальныя, а паэтычныя рашэнні прымушаюць міжволі заміраць:

*Мой абветраны сад.*
*Мой здранцвелы, заплаканы сад!*
*Ты галінкаю голай*
*За сэрца кранаеш, бялесны...*
*Ты начамі не спіш.*
*Прадчуваеш: ідзе снегапад!*
*І чакаеш яго,*
*Нібы лыжачкі манны нябеснай.*

Пранікнёная паэзія вядомай пісьменніцы Зінаіды Дудзюк, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі 2018 года, дае магчымасць чытачу асэнсаваць жыццё, яго арыенціры, глыбінныя і базавыя каштоўнасці. Вобразы павучка, які займаецца сваёй працай, нягледзячы на вялікі складаны чалавечы рух, і прахожага, які выглядае такім бездапаможным на фоне прыроднай стыхіі, падштурхваюць чытача да сур'ёзных роздумаў.

Ганна Клімовіч, Іван Куцко, Марыя Шадуя робяць першыя, але ўпэўненыя крокі ў літаратуры. Іх вершы, якія ўвайшлі ў раздзел «Першы крок», – адлюстраванне прамяністага, радаснага жыцця, напоўненага захапленнем ад новых адкрыццяў і ўражанняў.

Раздзел «Іскры з-пад капытоў Пегаса...» прадстаўлен фантастычнымі апавяданнямі і мініяцюрамі Сяргея Белаяра, рэалістычнымі апавяданнямі Святланы Гарадзецкай і аўтара гэтых радкоў, шчырымі празаічнымі творамі Ірыны Фаміной, заснаваных на ўнутраных перажываннях, назіраннях, у водблесках якіх у чытача з'яўляецца магчымасць пачуць рэха сваіх успамінаў.

Самае вялікае багацце – сям'я, самая вялікая моц – любоў, якую не можа перамагчы нават смерць. Апавяданне Галіны Бабарыкі «Бацька» закранае самыя балючыя моманты ў сямейна-бытавых зносінах.

У раздзеле «Дзіцячы гарадок» незвычайныя падзеі ў апавяданні Вольгі Сандрыкавай «Чараўніцтва Спірыдонаў у Стулах» пераносяць юнакоў у старое




сяленне Белавежскай пушчы, дзе нараджаюцца сапраўдныя казкі. Іскрынкамі дабрыні прасякнуты апавяданні Наталлі Шляжка і чароўныя гісторыі Наталлі Кухліч.

Ганаровымі гасцямі «Берасцейскай скарбніцы» сталі члены Саюза пісьменнікаў Расіі Наталля Раўкова, Ганна Самойлава, а таксама іванаўскі паэт Валерый Кухарчук, які зараз жыве ў Злучаных Штатах Амерыкі.

У раздзеле «Капліца памяці» змешчана апавяданне Мікалая Елянеўскага «Южный склон», у якім напружаныя трагічныя падзеі адбываюцца ў далёкім Афганістане. Дарэчы, Мікалай Елянеўскі на святкаванні Дня беларускага пісьменства пасмяротна атрымаў узнагароду абласнога літаратурнага конкурсу «Духоўная веліч» у намінацыі «Проза» за кнігу «Мытари и фарисеи».

Апошні раздзел «Ратнае поле» прадстаўлен рэцэнзіямі студэнтак філалагічнага факультэта БрДУ імя А.С.Пушкіна. Ксенія Якімук неардынарна падыйшла да аналізу кнігі Наталлі Касцюк «Детдомовские рассказы», а Таццяна Сільвестрава па-мастацку таленавіта і чулліва раскрыла паэтычны свет Галіны Бабарыкі.

Творы, прадстаўленыя ў кнізе, вылучаюцца сур'ёзнасцю, лірычнасцю, яркімі мастацкімі рашэннямі, адлюстроўваюць прыгажосць жыцця, духоўнае багацце нашага краю.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ,**
**старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі**